Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды ў Мінску, Гародні, Гомелі, Бабруйску дапоўнена

23.03.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Суд у Гародні 23 сакавіка

У судзе Ленінскага раёна **Гародні** пачаўся разгляд адміністрацыйных спраў удзельнікаў акцый пратэсту супраць Дэкрэта №3.

Судзяць **Эдварда Дмухоўскага, Валерыя Курчэўскага, Валянціну Навумаву, Віталя Дзюка, Мікалая Саляніка, Васіля Корабава** і магчыма **Антона Вайцехава.** Іх вінавацяць у парушэнні артыкула 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве). У Навумавай дадаткова пратакол складзены і па артыкуле 23.4 КаАП (непадпарадкаванне патрабаванням супрацоўніка міліцыі).

У Ленінскім судзе на працэсе **Васіля Корабава** абвешчаны перапынак да 14.10. Суддзя Дзмітрый Бубенчык вынес пастанову - штраф 7 базавых велічынь.

Суддзя Наталля Козел засудзіла: **Віталь Дзюк** штраф 15 базавых.

Валерыю Курчэўскаму - штраф 15 базавых. **Эдварда Дмухоўскага** пакаралі арыштам на 15 сутак. Справы разглядала суддзя Алена Пятрова.

Суддзя Козел разглядае справу Валянціны Навумавай. Сведкі, якія хацелі гвалтоуна затрымаць 15-га сакавіка Навумаву - старшы нараду АМАП Сяргей Чыгрыцкі, амапавец Яуген Валхановіч і фельдшарка АМАП Наталля Юргель. **Валянціне Навумавай -** штраф 13 базавых плюс 2 базавыя па іншым артыкуле.

У судзе Савецкага раёна **Гомеля** 23 сакавіка пачнецца разгляд адміністрацыйнай справы журналіста **Яўгена Меркіса** за ўдзел у акцыі пратэсту ў Рагачове па адміністрацыйным правапарушэнні па арт. 22.9 АК РБ “Незаконны выраб прадукцыі СМІ”.

Журналісту Яўгену Меркісу прысудзілі штраф у 30 базавых «за онлайн» з Рагачова.

Савецкі суд Гомелю 23 сакавіка будзе разглядаць адміністрацыйную справу супраць блогера **Максіма Філіповіча**. Філіповіч адбывае арышт за ўдзел у «Маршы недармаедаў» у Гомелі 19 лютага, а сёння разглядаецца справа за ўдзел у «Маршы недармаедаў» у Берасці 5 сакавіка. Савецкі суд Гомеля арыштаваў блогера Максіма Філіповіча яшчэ на пяць сутак. Справу блогера разглядаў суддзя Аляксандар Мохараў. У залі прысутнічалі жонка і маці Філіповіча.

Праваабаронцу **Анатоля Паплаўнага**, які адбывае 10 суткавы арышт, сёння за ўдзел у іншай акцыі ў Рагачове пакаралі яшчэ адным арыштам на 5 сутак. У Савецкі суд Гомеля яго прывезьлі з ізалятару, дз ён адбывае 10 сутак арышту за ўдзел у "маршы недармаедаў" у Гомелі.

Наталля Шчукіна судом Савецкага раёна пакараная штрафам у 10 базавых (230 рублёў) за ўдзел у акцыі пратэсту ў Рагачове.

Алу Раманчык судзьдзя Віталь Каўбеня аштрафаваў на 15 базавых (345 рублёў)

Мінск. У судзе Цэнтральнага раёна Мінска разглядаецца справа лідара руху салідарнасці «Разам» **Вячаслава Сіўчыка.** Яго вінавацяць ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве па ч.3 арт 23.34 КаАП.

Суддзя Вікторыя Шабуня праглядзела відэазапіс акцыі пратэсту з удзелам актывіста. У якасці сведкі выступіў Вячаслаў Шкут, намеснік начальніка Савецкага АПП. Сам Сіўчык на суд не прыйшоў. Прысуд - арышт тэрмінам на 15 сутак. Пазней стала вядома, што **Вячаслаў Сіўчык** затрыманы на пахаванні свайго дзядзькі.

У судзе Ленінскага раёна Мінска павінны разглядацца адміністрацыйныя справы **Мікалая Статкевіча і Уладзіміра Някляева**. 20 сакавіка судоў над Мікалаем Статкевічам і Уладзімірам Някляевым не было - яны не з'явіліся ў суд.

Радыё Свабода паведамляе, што суд над Міколам Статкевічам аднавіўся ў судзе Ленінскага раёну Менску, але самога палітыка на ім зноў не было.

Суддзя Дзмітрый Астапенка абвясціў пра захады забеспячэння яўкі Міколы Статкевіча, паведаміў, што да яго прыходзілі міліцыянты, грукаліся ў дзверы, але ніхто не адчыніў. Суддзя пастанавіў адкласці паседжанне. Калі яно аднавіцца, не паведаміў.

Тое ж адбылося на судзе над Уладзімерам Някляевым, які таксама на не з'явіўся ў судзе. Ягоны адміністацыйны працэс перанеслі на 14.30 у пятніцу, 24 сакавіка.

Алеся Лагвінца і **Анатоля Шумчанку** даставілі ў суд Маскоўскага раёна г. Мінска. Алеся Лагвінца вінавацяць у дробным хуліганстве па арт. 17.1 КаАП. У суд для Алеся Лагвінца выклікалі хуткую дапамогу.



Алесь Лагвінец у судзе. Фота з сацсетак

Бабруйск. У Галіны Смірновай сёння суд у 14.00 меркавана. Яе затрымалі ў маршрутцы, калі яна вярталася з Мінску. Яе вінавацяць па арт. 23.34 КаАП за тое, што яна змясціла на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках інфармацыю пра Марш недармаедаў, што плануецца на 26 сакавіка ў розных гарадах краіны. Зараз супрацоўнікі ГАУС Бабруйска ў адносінах да Галіны Смірновай складаюць пратакол апытання. У яе адабралі ноўтбук і тэлефон, што былі пры ёй.

Шасцярых чалавек, якія чакалі суда над Галінай Смірновай павезлі ў пракуратуру для правядзення размовы. Сярод іх журналісты: **Ганна Дусь і Віктар Качан**, якога забралі разам са сваім сабакам. Таксама там муж **Галіны Смірновай і Інга Судзілоўская**, якую пакаралі штрафам на мінулым тыдні.

Пяцерых затым адпусцілі, а **Уладзімера Лазарава** павезлі у ГАУС Разгляд жа справы Галіны Смірновай ізноў перанеслі на 25 сакавіка.

У Чачэрску затрыманы да суду **Арцём Кавалёў.** Ён дастаўлены ў Чачэрскі РАУС. Пра гэта паведамляе на сваёй старонцы ў фэйсбуку праваабаронца **Леанід Судаленка.**Малады чалавек зь бел-чырвона-белым сьцягам быў у жывым эфіры Свабоды з «Маршу недармаедаў» у Гомлі 19 лютага.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre
memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY